**Ляўко А.Т.,** *прафесар*

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ НАКІРУНКІ ВЫВУЧЭННЯ СУТНАСЦІ КУЛЬТУРЫ ЯК УМОВА ВЫЗНАЧЭННЯ АСНОЎНЫХ МЭТ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Культуралогія — адносна новая вучэбная дысцыпліна ў ВНУ, сутнасць якой і адносіны з другімі навукамі да канца не вызначаны. Яскрава не акрэслены нават асноўныя мэты культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Змены, што адбываюцца ў апошнія гады ў грамадстве, у яго эканамічным і палітычным жыцці, шмат у чым закранулі і ўяўленні аб сутнасці самой культуры. Калі да нядаўняга часу культура ўяўлялася выключна як ідэалагічная надбудова над эканамічным базісам, то сёння ў большасці выпадкаў эканоміка звязваецца з асаблівасцямі той ці іншай культуры. Таму становіцца відавочным, што адной прапаганды ідэалагічных каштоўнасцей культуры недастаткова. Патрэбна адпаведная сацыялізацыя асобы, уключэнне яе ў тыя ці іншыя сацыяльна-культурныя адносіны. І культуралогіі тут адводзіцца адна з вызначальных роляў.

У той жа час сацыялізатарскія магчымасці культуралогіі зусім не з'яўляюцца сведчаннем таго, што культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў павінна ўключаць і сацыялагічную падрыхтоўку, што сацыялогія з'яўляецца толькі структурнай часткай апошняй і адносіцца да яе так, як у былыя часы адносілася да гістарычнага матэрыялізму. Культура — толькі адна з падсістэм, якую вывучае сацыялогія. Прадмет сацыялогіі культуры — адносіны культуры і грамадства, роль культуры ў грамадскім развіцці. Культуралогія ж даследуе культуру як сістэму, набор з'яў і галіну ведаў, маючых сваю спецыфіку, метадалогію і тэорыю развіцця. Дадзеная сістэма, безумоўна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

закранае і сацыяльны працэс ў выглядзе матэрыяльнай і духоўнай дзейнасці чалавека і адпаведных вынікаў гэтай дзейнасці, накіраванай на пабудову складанага штучнага асяроддзя, якое апасродкуе адносіны чалавека да грамадства і прыроды.

Вызначальная роля належыць тут так званай сімвалічнай культуры (маюцца на ўвазе разнастайныя знакавыя сістэмы), культуры, існуючай пераважна ў ідэалізаванай форме ці ў выглядзе тых ці іншых ідэалаў, з дапамогай якіх рэчаіснасць не толькі адлюстроўваецца, але і перабудоўваецца, развіваецца як творчы працэс. Гэтая культура заснавана на схематызаваных і эталонных спосабах мыслення, успрымання і рэагавання, здабытых і перадаваемых, галоўным чынам, з дапамогаю сімвалаў, якія ўяўляюць сабой характэрныя дасягненні чалавечых груп. Такія сімвалы знаходзяць увасабленне ў матэрыяльных творах, істотнае ядро якіх складаюць традыцыйныя ідэі і звязаныя з гэтымі ідэямі каштоўнасці.

Засяроджанне ўвагі на змястоўным сэнсе традыцыйных форм культуры фарміруе ў якасці галоўнай мэты культуралагічнай падрыхтоўкі нацыянальна-культурнае адраджэнне, якое ўсведамляецца як узнаўленне ўсіх тых культурных здабыткаў народа, што існуюць у выглядзе друкаваных твораў, мастацтва, рэлігійных і філасофскіх ідэй, але не даведзены па тых ці іншых прычынах да свядомасці народа, не сталі часткай яго нацыянальнай свядомасці. Ядром апошняй з'яўляецца гістарычная памяць, без якой асоба не мае сацыяльных каранёў, выступае «манкуртам», адарваным ад свайго грамадскага жыцця, свайго народа.

Перанос увагі толькі на сімвалічныя формы культуры вядзе да ўяўлення аб ёй як выключна інфармацыйным працэсе ў выглядзе трансляцыі праграм дзейнасці, зносін і паводзін людзей. Лічыцца, што з дапамогай расшыфроўкі гэтых праграм, ствараючых у сукупнасці калектыўную памяць грамадства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасягаецца далучэнне індывідаў да ведаў і вопыту папярэдніх пакаленняў.

Культура, згодна з такім падыходам, разумееца як інфармацыя, увасобленая ў практыцы (што адпавядае матэрыяльнай культуры) або ў структурах паўсядзённай ці спецыялізаванай мовы, у навуковых і мастацкіх тэкстах (духоўная культура). Галоўны змест культуры тут — сацыяльная інфармацыя ці асобая знакавая сістэма, у якой замацоўваецца сацыяльны вопыт і якая выконвае функцыю сацыялізацыі індывідаў. Культурны ж працэс успрымаецца як сігнальна-інфармацыйны. Адсюль і адпаведнае ўяўленне аб асноўных мэтах культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Яно характарызуецца адмоўнымі адносінамі да так званых традыцыйных каштоўнасцей гуманітарнай культуры, да самой ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння. Найбольш яскравым увасабленнем такога разумення культуры з'яўляецца тэорыя «мазаічнай» культуры французскага сацыёлага Абраама Моля, змест якой адлюстраваны ў яго вядомай працы «Сацыядынаміка культуры». Згодна з Молем, культура — гэта інтэлектуальны аспект штучнага асяроддзя, «экран ведаў», вызначаны выпадкова - статыстычна і нагадваючы сабой нейкае валакністае ці «мазаічнае» стварэнне, складзенае з мноства розных фрагментаў.

Прадстаўнікі гэтага метадалагічнага накірунку ў вывучэнні сутнасці культуры галоўнай мэтай культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў лічаць далічэнне іх да сацыяльных норм і ідэй мадэрнізму і постмадэрнізму, новых інфармацыйных тэхналогій, культурных узораў, праектаў і схем сацыяльна-культурнага развіцця, заснаваных на навуковых прагнозах і ўсведамленні каштоўнасці самой асобы, яе інтарэсаў і інтарэсаў іншых людзей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Якой бы значнай ні была гэтая мэта культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, яна не адлюстроўвае ўсёй сутнасці культуры і яе магчымасцей грамадскага развіцця і развіцця кожнай асобы. Побач з сімвалічнымі формамі культуры існуюць паўсядзённыя, якія не з'яўляюцца штучнымі, не накладваюцца на жыццё чалавека штучным чынам, а быццам выцякаюць з самой сутнасці яго жыццядзейнасці. Эканамічная, рэгіянальная культуры, напрыклад, не зводзяцца толькі да агульных нацыянальных ідэй і каштоўнасцей, да мовы і іншых сімвалічных форм, а адлюстроўваюць сам вопыт жыццядзейнасці адпаведных этнасаў, народаў, тэрытарыяльных абшчын, паселішчаў і г.д. Іх патрэбы і інтарэсы цесна звязаны з прыродай самога чалавека, прыроднымі (кліматычнымі, геаграфічнымі, экалагічнымі) і сацыяльнымі (эканамічнымі, дэмаграфічнымі і іншымі) умовамі жыцця. Агульны вопыт спрыяе тут фарміраванню агульных рыс свядомасці, характару, пасвядомага рэагавання, якія складаюць аснову менталітэту ці глыбінных якасцей духоўнасці чалавека, сацыяльных супольнасцей і абшчын. Менталітэт этнасу, народа, жыхароў рэгіёнаў і паселішчаў адлюстроўвае ў сабе як сімвалічную культуру (рэлігію, філасофію, навуку, мастацтва, мараль і г.д.), так і пачуцці, вобразныя і іншыя ўяўленні, рытуалы, звычаі, стэрэатыпы мыслення, у якіх сканцэнтраваны найбольш істотныя моманты жыцця людзей, замацаваны вопыт гэтага жыцця.

Культура ў гэтым выпадку разглядаецца як своеасаблівы вынік пастаяннага прыстасавання да выпадковых абставін жыцця, да непрадугледжаных падзей, якія немагчыма было пераадолець.

Асноўнай мэтай культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў пры такім метадалагічным накірунку вывучэння сутнасці культуры з'яўляецца развіццё сацыяльна-культурнай прыроды кожнага індывіда як прадстаўніка адпаведнага этнасу, жыхара адпаведнай краіны, тэрыторыі, паселішча. Гэта мэта дасягаецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за кошт давядзення да свядомасці студэнтаў той акалічнасці, што існуючы сацыяльны парадак не ёсць вынік толькі свядомай задумы, а шмат у чым стыхійна ўзнікае з непасрэднага накірунку, вызначанага традыцыйнай (і, галоўным чынам, рэальнай) практыкай. Людзі, якія арыентуюцца на гэту практыку, звычайна не ўсведамляюць яе значнасць для сябе. Тым не менш менавіта яна вызначае магчымасці нашага разуму, а не наадварот. Выпрацаваныя на працягу гісторыі развіцця адпаведнага этнасу ці народа, маральныя нормы, эстэтычныя ўяўленні і стыль мастацтва вызначаюць і адпаведны стыль мыслення. Таму пры выкладанні культуралогіі адначасова з прапагандуемай рацыянальнай мараллю патрэбна вызначыць мараль жыццядзейнасці адпаведнага этнасу, этыку жыцця таго ці іншага народа, рэгіёна, паселішча. Гэта прынцыпова важна для культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў па такіх спецыяльнасцях, як рэжысура народных свят, народныя промыслы і рамёствы, сацыяльная педагогіка і культурная дзейнасць ў вольны час, мастацтвазнаўства і інш.

Арыентацыя культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў на сацыялізацыю іх асобы з'яўляецца заўжды аднабаковай, калі яна мае на ўвазе выключна існуючыя ў грамадстве нормы і сацыяльныя функцыі, інстутыялізаваныя формы паводзін і не ўлічвае развіццё індывідуальнасці кожнай асобы як суб'екта адпаведнай культуры. Фарміраванне ж асобы студэнта як суб'екта культуры з дапамогай культуралагічнай яго падрыхтоўкі грунтуецца пераважна на разуменні культуры як выніку эканамічнага сацыяльна-культурнага развіцця грамадства і духоўнага развіцця індывіда.

Сфарміраваць у асобе кожнага студэнта суб'екта той ці іншай культуры — значыць сфарміраваць яго індывідуальнасць, значыць разглядаць культуралагічную падрыхтоўку праз прызму працэсу індывідуалізацыі ці станаўлення і развіцця духоўнага свету індывіда, яго самасвядомасці праз сацыяльнае ўзаемадзе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

янне з іншымі людзьмі. Сама духоўнасць выступае тут як здольнасць пераводзіць універсум знешняй рэчаіснасці ва ўнутраную прастору асобы, здольнасць ствараць той унутраны свет чалавека, дзякуючы якому рэалізуюцца яго самастойнасць, яго незалежнасць у зменлівай сітуацыі.

Духоўнае развіццё асобы студэнта як мэта культуралагічнай падрыхтоўкі грунтуецца пераважна на засваенні адпаведных каштоўнасцей грамадства, яго ідэалогіі. Каштоўнасці выступаюць тут не толькі як узоры пазнання. Яны з'яўляюцца таксама і ўзорамі асэнсавання паводзін і свядомасці людзей і арыентацыяй на іх ажыццяўленне. Пры гэтым каштоўнасцю культуры лічыцца любы пагранічны сэнс учынку, выбару, ацэнкі індывіда ці супольнасці, калі гэты сэнс з'яўляецца родавым паняццем у адносінах да такіх пагранічных узораў свядомасці, як прынцып, ідэал, канчатковая мэта, сакральны сімвал і інш. У прасторы культуры сэнсы маюць статус сэнсавых і лагічных сутнасцей.

У грамадскім жыцці адрозніваюць каштоўнасці экзістэнцыяльныя (патрэбнасці асобы і яе інтарэсы), рацыянальныя (ідэалы, прынцыпы, мэты), духоўна-маральныя (дабро, свабода і інш). Згодна з аналізуемым метадалагічным накірункам вывучэння сутнасці культуры, чалавек стварае духоўны свет, якому шмат у чым адпавядаюць і сацыяльны лад, сацыяльныя змяненні, сацыяльны прагрэс.

Такім чынам, даследаванне асноўных метадалагічных накірункаў вывучэння сутнасці культуры дазваляе вызначыць наступныя мэты культуралагічнай падрыхтоўкі ў вышэйшых навучальных установах:

— культурна-асветніцкая дзейнасць па задавальненню культурных патрэбнасцей асобы;

— сацыялізацыя асобы;

— індывідуалізацыя асобы;

— нацыянальна-культурнае адраджэнне;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— фарміраванне ідэалогіі мадэрнізму, накіраванай на пераход ад сацыяльных каштоўнасцей індустрыяльнага грамадства і заснаваных на іх тэхналогій да каштоўнасцей постіндустрыяльнага грамадства.

Актуальнасць кожнай з гэтых мэт вызначаецца ўзроўнем развіцця самога грамадства, яго прасторава-часавымі характарыстыкамі, менталітэтам, экалогіяй, эканомікай, ідэалогіяй і г.д. Так, апора на існуючыя прыродныя фактары жыццядзейнасці грамадства садзейнічае развіццю народнай культуры, якая ўяўляе сабой асэнсаванне вопыту народа (этнасу) у міфалагічнай, рэлігійнай, філасофскай і навуковай форме, замацаванай у звычаях, традыцыях, рытуалах, ладзе жыцця. Развіццё гэтай культуры адбываецца ў адпаведнасці з прынцыпамі самаразвіцця. Яна ўяўляе сабой вынік сацыягенезу, эвалюцыі адпаведнага этнасу ці народа і мае свае непаўторныя асаблівасці, звязаныя з асаблівасцямі ўмоў жыцця.

Жаданне падпарадкаваць знешнія ўмовы жыцця працэсу задавальнення патрэбнасцей вядзе да развіцця рацыянальнай навукова-тэхнічнай культуры, культуры, заснаванай на спасціжэнні заканамернасцей развіцця свету, знешніх прычынна-выніковых сувязей і адносін. Заваяванне прыроды непарыўна звязана з пабудовай штучных тэхнічных, інфармацыйных і іншых сістэм, абсалютызацыя якіх разбуральна дзейнічае на знешнюю прыроду і на самога чалавека.

Імкненне чалавека авалодаць сваім унутраным светам, самім сабой вядзе да ўзнікнення і развіцця духоўнай культуры (у аснове якой ляжыць асэнсаванне каштоўнасцей і сэнсу жыцця) і маральнага асваення сацыяльнай рэчаіснасці. Развіццё гэтай культуры заснавана на развіцці індывідуальнасці кожнай асобы, яе духоўнасці.

Гармонія ўсіх трох культур стварае ўмовы гарманічнага развіцця грамадства і асобы. Дасягаецца гэта мэта толькі пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмовеператварэння духоўнай культуры ў сістэму, якая самаразвіваецца, грунтуецца на здольнасці кожнага індывіда самастойна рэгуляваць сваю жыццядзейнасць, і пры супадзенні існуючых у грамадстве інстытуялізаваных рацыянальных сацыяльных нормаў з жыццёвай пазіцыяй кожнай асобы і накірунку сацыягенезу адпаведнага этнасу. Але такая гармонія бывае рэдка. На адных этапах гістарычнага развіцця грамадства чалавек разглядаецца выключна як састаўная частка прыроды, космасу, на гэтых этапах ён свядома імкнецца вызначыць сваю дэтэрмінаванасць знешнім светам. Прыкладам можа быць старажытная грэчаская цывілізацыя. Для другіх этапаў характэрна імкненне спасцігнуць свой духоўны свет (сярэднявечча), а для трэціх асноўнай мэтай выступае перабудова свету ў адпаведнасці з развіццём кожнай асобы не як часткі прыроды, а як самастойнага суб'екта навукова-тэхнічнай культуры.

Усведамленне гэтых асаблівасцей праз культуралагічную падрыхтоўку дае магчымасць студэнтам зразумець глабальныя праблемы сучаснасці і асноўныя сродкі іх магчымага вырашэння. Па меншай меры становіцца зразумелым, што існуючыя экалагічныя, эканамічныя і многія іншыя праблемы можна вырашаць на шляху развіцця духоўнай культуры, індывідуальнасці кожнай асобы і пазнання сацыяльна-культурнай прыроды кожнага народа, асноўных накірункаў яго сацыягенезу як культуры выжывання. Гармонія прыроднага і духоўнага жыцця магчыма толькі на шляху эвалюцыі народнай культуры, на аснове народнага менталітэту і менталітэту этнасаў, на аснове тых сацыяльных нормаў, якія не з'яўляюцца штучнымі.

Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў між тым не вычэрпваецца асэнсаваннем глабальных праблем сучаснасці. Студэнту даецца магчымасць усвядоміць і сутнасць існуючых нацыянальных, рэгіянальных і іншых сацыяльна-культурных праблем (напрыклад, маргінальны характар беларускай культуры як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўная ўмова яе развіцця, натуральнасць вясковай і штучнасць гарадской культур). Культуралагічная падрыхтоўка дае магчымасць зразумець, што вырашэнне нацыянальных, рэгіянальных, тэрытарыяльных праблем цесна звязана са спасціжэннем часава-прасторавых сацыяльных характарыстык той ці іншай краіны, края, тэрыторыі, тыпу паселішча. Нямецкая пунктуальнасць і наша асабістая разважліваць і схільнасць адкладваць вырашэнне важных спраў на заўтра — гэта не проста рысы нацыянальнага характару. Само паняцце сацыяльнага характару з'яўляецца ключавым для разумення грамадскага працэсу. Характар, як лічыць вядомы амерыканскі даследчык Эрых Фром, — гэта спецыяльная форма чалавечай энергіі, якая ўзнікла ў працэсе дынамічнай адаптацыі чалавечых патрэб да вызначаных узораў жыцця ў адпаведным грамадстве. Характар — адкрэсленыя думкі, пачуцці і дзеянні індывіда.

З дапамогай культуралагічнай падрыхтоўкі, вывучэння сацыялогіі культуры, этнаграфіі і іншых навук аб культуры становіцца магчымым своеасаблівы светапоглядны пераварот, пераасэнсаванне традыцыйных уяўленняў, згодна з якімі наша мысленне з'яўляецца пераважна інтэлектуальным актам, незалежным ад псіхічнай структуры асобы. Між тым кожнае паняцце, кожная дактрына заключаюць ў сабе нейкую эмацыянальную аснову, якая вызначаецца складам характару індывіда. Сам жа склад характару і звязаны з ім тып мыслення развіваюцца з патрэбнасцей авалодання матэрыяльнай сферай, патрэбнасцей і інтарэсаў адпаведных сацыяльных груп. Між тым чалавек жыве ілюзорным уяўленнем, што ён ведае, чаго хоча. На самай справе ён хоча таго, чаго павінен хацець у адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі, правіламі, устаноўкамі.

Самы час у прадстаўнікоў розных культур — своеасаблівае выяўленне якасці жыцця, асаблівасцей існуючых у грамадстве формаў сацыялізацыі асобы. У адных грамадствах перайманне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існуючых культурных формаў жыццядзейнасці накіравана выключна на старэйшых, на звычай і традыцыю, што замаруджвае рух сацыяльнага часу. Там жа, дзе працэс сацыялізацыі звернуты ў будучыню, звычай вяне, і грамадства дынамічна накіроўваецца па шляху змяненняў і росту. Культурнае адлюстраванне часу ажыццяўляецца ў сімвалах, каштоўнасцях, правілах і арыентацыях, якія надаюць кожнаму грамадству выразны часавы профіль. Гэтая акалічнасць, як правіла, не ўспрымаецца пры выключнай арыентацыі толькі на канцэпцыі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Згодна з гэтымі канцэпцыямі, матэрыяльныя элементы вытворчых сіл грамадства выконваюць рашаючую ролю ў павышэнні эфектыўнасці працы, сацыяльным працэсе і фарміраванні новага прадстаўніка. Фарміраванне «чалавечых якасцей» тут ставіцца ў прамую залежнасць ад развіцця тэхнікі. Развіццё тэхнікі ўяўляецца як важнейшая частка развіцця культуры чалавецтва. Сацыяльна-культурны прагрэс цалкам ставіцца ў залежнасць ад тэхнічнай і прамысловай рэвалюцыі, якасных пераўтварэнняў у тэхнічных, энергічных, арганізацыйных і навуковых асновах працэсу працы. Навука, канструктарскія распрацоўкі, інфармацыя замест энергіі, інтэлектуалізацыя эканомікі — асновы мадэрнісцкай культуры, якія сёння ўсё больш выпрабоўваюцца праз праблемы матывацыі, індывідуалізацыі і духоўнасці, праз праблему творчасці. Ужо ў 60-70-я гады высветлілася, што чалавечыя, паводзінскія аспекты арганізацый праяўляюцца толькі ў канкрэтным кадравым складзе, стылі і навыках паўсядзённай працы. Больш таго, ва ўмовах павышэння патрабаванняў а адаптыўнай гібкасці, зменлівасці гаспадарчай арганізацыі менавіта гэтыя характарыстыкі выходзяць на першы план.

Тым самым знаёмства з асноўнымі метадалагічнымі накірункамі вывучэння сутнасці культуры ў сістэме культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў ставіць будучых менед-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жэраў, эканамістаў і іншых спецыялістаў перад праблемай выбару шляху далейшага развіцця рэспублікі, найбольш адэкватнага патэнцыяльным магчымасцям яе народа, яе культуры. Сацыялізацыя студэнтаў праз культуралагічную падрыхтоўку можа ажыццяўляцца на аснове рацыянальна вызначаных мэт жыцця, выбару адпаведных каштоўнасцей гэтага жыцця і фарміравання тых ці іншых сацыяльных патрэб і іх эмацыянальна-пачуццёвай накіраванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ігнатовіч П.Р.,** *дацэнт*

## КУЛЬТУРА: СУТНАСЦЬ І МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Паняцце «культура» адносіцца да ліку фундаментальных у сучасным грамадазнаўстве. Цяжка назваць другое слова, якое мела б такое мноства сэнсавых адценняў.

Культура як шматаспектная праблема разглядаецца ў навуковай літаратуры надзвычай неадназначна, часам супярэчліва. Па падліках амерыканскіх культуролагаў Альфрэда Крэбера і Клайда Клакхона, з 1871 г. па 1919 г. было дадзена сем азначэнняў паняцця «культура». Адным з першых яны лічаць азначэнне англійскага гісторыка культуры XIX в. Эдуарда Бернета Тайлара ў яго кнізе «Першабытная культура». З 1920 года по 1950 год з'явілася яшчэ 157 азначэнняў гэтага паняцця. Зараз, па адных ацэнках, існуе больш за 500 азначэнняў культуры, па другіх — каля тысячы!

Такое мноства трактовак паняцця культуры можна растлумачыць перш за ўсё тым, што культура выражае глыбіню і